**УДК 902.2:378(476.7)**

# АРГАНІЗАЦЫЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ШЛЯХЕЦКІХ РЭЗІДЭНЦЫЙ XVI – XIX стст. НА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЕ

***канд. гіст. навук, дац. А.А. БАШКОЎ***
***(Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна)***

*Разглядаюцца асноўныя пытанні арганізацыі археалагічных даследаванняў шляхецкіх рэзідэнцый XVI – XIX стст. на тэрыторыі Берасцейшчыны. Увага надаецца супрацоўніцтву архітэктараў-праекціроўшчыкаў, будаўнікоў-рэстаўратараў і археолагаў у даследдванні аб’ектаў рэзідэнцыянальнай архітэктуры, якія падлягаюць рэстаўрацыі і ўзнаўленню. Вылучаны і ахарактарызаваныя асноўныя этапы арганізацыйных мерапрыемстваў па археалагічным вывучэнні шляхецкіх рэзідэнцый.*

***Ключавыя словы:*** *археалагічныя даследаванні, шляхецкія рэзідэнцыі, Берасцейшчына, рэстаўруемая архітэктура.*

**Уводзіны.** Археалагічныя раскопкі, на помніках рэстаўруемай рэзідэнцыянальнай архітэктуры з’яўляюцца неад’емнай часткай даследчых і будаўнічых прац. Археалагічныя раскопкі павінны праводзіцца на аб’ектах рэстаўрацыі ўжо на пачатковым этапе распрацоўкі праектнай дакументацыі. Толькі так можна паглыблена падыйсці да вывучэння архітэктурнага помніка: вызначыць яго аб’ектыўныя памеры і тэхніку будоўлі; рэканструяваць знешні выгляд; зразумець і дапоўніць канструктыўныя элементы; даць будаўнічую перыядызацыю. Толькі пасля гэтага можна прымаць абгрунтаваныя, выверавыя інжынерныя рашэнні. Несвоечасовыя археалагічныя даследаванні на архітэктурным помніку цягнуць за сабой памылкі і недакладнасці ў працы архітэктара, што прыводзіць да каррэктыроўкі і змены самога праекту, а ў выніку – вытворчыя траты. Сёння падобны від працы археолагаў прынята называць архітэктурна-археалагічнымі даследаваннямі, што маюць уласную методыку і праводзяцца выключна ў зоне архітэктурнага помніка з ініцыятывы архітэктара-рэстаўратара, які ставіць канкрэтныя мэты і задачы [11, с. 107–109].

Станаўленне і развіццё архітэктурна-археалагічных даследаванняў на Беларусі прайшло значны і складаны шлях, што прывяло да пашырэння крынічнай базы, удасканалення методыкі і эмпірычнага вопыту даследчыкаў-археолагаў. У канцы 80-х гг. XX ст. у выніку назапашвання вопыта архітэктурна-археалагічных даследаванняў на помніках манументальнага дойлідства Беларусі перыяду Сярэднявечча і Новага часу, з’явілася неабходнасць абагульнення і сістэматызацыі дадзенага матэрыялу. Акрамя таго, супрацоўніцтва праектна-рэстаўрацыйных арганізацый з археолагамі, дазволілі выпрацаваць асновы методыкі комплекснага вывучэння “позніх” архітэктурных помнікаў, у тым ліку шляхецкіх сядзіб і рэзідэнцый [1, с. 11–13].

Як вынік, на свет з’явілася першае абагульняючае тэарэтыка-практычнае даследаванне А.А. Трусава «Памятники монументального зодчества Беларуси XI – XVII вв.: архитектурно-археологический анализ». У манаграфіі аўтар свядома адышоў ад мастацтвазнаўчых пытанняў і праблем гісторыі архітэктуры, а сканцэнтраваўся толькі на гісторыі і методыцы археалагічнага вывучэння архітэктурных помнікаў. Праца А.А. Трусава стала неад’емным спадарожнікам спецыялістаў-археолагаў, якія вывучаюць помнікі позняга Сярэднявечча і Новага часу. Аўтар даў характарыстыку ўзроўню даследаванасці (на той час) такіх помнікаў, зрабіў аналіз існуючых метадаў вывучэння архітэктурных аб’ектаў, унёс прапановы па іх удасканаленні, зрабіў аналіз будаўнічай тэхніцы і матэрыялаў, якія выкарыстоўваліся для ўзвядзення архітэктурных аб’ектаў у розныя перыяды гісторыі беларускай архітэктуры [15].

З пачатку 2000-х гг. на Беларусі назіраецца “ажыўленне” рэстаўрацыйных прац, ідзе працэс удасканалення заканадаўчай базы аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку і археалагічных помнікаў. З’явілася патрэба ў чарговай сістэматызацыі, каардэнацыі і рэгуляванні дзейнасці археолагаў, архітэктараў, будаўнікоў, інвестараў будоўлі, дзяржавы. Заканамерным стала з’яўленне кнігі В.М. Ляўко «Практическая археология», якая выйшла ў 2006 г. [5]. Праца стала накшталт метадычнага дапаможніка з вывераным “алгарытмам” дзеянняў для археолагаў, якія праводзяць выратавальныя даследаванні, у тым ліку на рэстаўруемых помніках.

Такім чынам, канстатуючы невялікую колькасць спецыялізаваных прац па метадычных і арганізацыйных пытаннях археалагічных даследаванняў на архітэктурных помніках Новага часу, у прадстаўленай працы мы разгледзім асноўныя праблемы і этапы арганізацыі археалагічных даследаванняў шляхецкіх рэзідэнцый XVI – XIX стст. на прыкладзе аб’ектаў з тэрыторыі Брэсцкай вобласці.

**Асноўная частка.** На шэрагу шляхецкіх рэзідэнцый Берасцейшчыны апошнім часам разгарнуліся рэстаўрацыйныя і ўзнаўляльныя працы, гэта аб’екты ў Ружанах, Косаве, Скоках, Закозелі і інш. Сёння філіял “Белрэстаўрацыі” ААТ “Брэстрэстаўрацыяпраект” ажыццяўляе іх рэстаўрацыйнае праектаванне, якое істотна адрозніваецца ад праектавання “з нуля” іншых архітэктурных аб’ектаў. У рамках падрыхтоўкі

рэстаўрацыйнага праекта разам з навукова-рэстаўрацыйным абгрунтаваннем і папярэднімі працамі, праводзяцца комплексныя навуковыя даследаванні (далей – КНД). Яшчэ ў 2008 г. у ААТ "Брэстрэстаўрацыяпраект" у створаны аддзел комплексных навуковых даследаванняў быў уведзены штатны спецыяліст-археолаг. У ходзе падрыхтоўкі рэстаўрацыйных праектаў для канкрэтнай рэзідэнцыі аддзел КНД павінен быў сабраць і абагульніць даступны навуковы матэрыял для атрыбуцыі помніка, вызначэння яго культурна-гістарычнай значнасці, адлюстравання поўнай і аб'ектыўнай карціны яго тэхнічнага стану. Для дасягнення пастаўленых мэт неабходна было правесці: гісторыка-архіўныя і бібліяграфічныя даследаванні; архітэктурныя і архітэктурна-археалагічныя абмеры помніка; інжынерна-канструктарскія, тэхналагічныя і лабараторныя даследаванні, а таксама натурныя даследаванні ў выглядзе шурфоў, зандажоў і археалагічных раскопак.

Что датычыцца цікаўных нам рэзідэнцый Берасцейшчыны, то на стадыі падрыхтоўкі праекта, спецыялісты ААТ "Брэстрэстаўрацыяпраект" сутыкнуліся з шэрагам цяжкасцей. Праектуемыя аб'екты ў Ружанах, Скоках, Косаве і Закозелі мелі розную ступень захаванасці. Некаторыя аб'екты гэтых архітэктурных ансамблей былі цалкам, альбо часткова разбураны ў выніку гістарычна склаўшыхся аб'ектыўных абставін. Як вынік – сляды іх існавання і рэшткі канструкцый балі "паглыненыя" культурным слоем. Гэтыя архітэктурныя комплексы страцілі не толькі канструктыўныя элементы наяўных будынкаў, але і некаторыя збудаванні цалкам, якія ўваходзілі ў архітэктурны ансамбль. Раней сабраныя і падрыхтаваныя матэрыялы для рэстаўрацыйных прац (у канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст.) страцілі сваю актуальнасць. Адчувальным з'яўляўся дэфіцыт гістарычных звестак, у першую чаргу іканаграфічных, якія маглі бы дапамагчы архітэктарам ва ўзнаўленні страчаных канструктыўных элементаў будынкаў, іх унутраннага інтэр'еру ды саміх архітэктурных ансамбляў.

Для кампенсацыі інфармацыйнага дэфіцыту, рэстаўратарам спатрэбіўся набор спецыялізаваных метадаў класічнай археалогіі і архітэктурна-археалагічных даследаванняў. Гэта і стала аб'ектыўнай прачынай правядзення на пазначаных архітэктурных помніках значных археалагічных раскопак.

Перад пачаткам археалагічных даследаванняў, важнейшым момантам стала ўзгадненне канкрэтных мэт і задач паміж архітэктарамі-праекцероўшчыкамі і археолагамі.

Асноўнай мэтай праекціроўшчыкаў стала дапаўненне і карэкціроўка на падставе вынікаў археалагічных даследаванняў праектнай дакументацыі на канкрэтныя архітэктурныя аб'екты рэзідэнцыянальных комплексаў, а таксама ўдакладненне рашэнняў па ландшафтным праектаванні, зонам добраўпарадкавання і ахоўным зонам.

Асноўнай мэтай археолагаў выступала комплекснае даследаванне шляхецкіх рэзідэнцый метадамі класічнай археалогіі і архітэктурна-археалагічных даследаванняў для прадстаўлення рэстаўратарам неабходнай інфармацыі для падрыхтоўкі праектнай дакументацыі, а таксама рэканструкцыі аб'ектыўнай карціны станаўлення і развіцця дадзеных помнікаў як адзінага "арганізму" ў кантэксце агульнагістарычных працэсаў.

Для археолагаў былі сфармуляваны наступныя задачы:

1. Знайсці візуальна не фіксуемыя збудаванні і канструктыўныя элементы асобных будынкаў.

2. Вызначыць аб'ектыўныя памеры і захаванасць асобных канструктыўных элементаў, часткова албо цалкам сакрытых у зямлі.

3. Вывучыць структуру ўсяго комплекса і планіроўку асобных будынкаў, а таксама асаблівасці будаўнічай тэхнікі і матэрыялу.

4. Вывучыць культурныя пласты на даследуемым архітэктурным помніку для больш дэталёвай культурнай атрыбуцыі і вызначэння яго кантэкстных узаемасувязяў з іншымі будынкамі архітэктурнага ансамблю, альбо аб'ектамі папярэдніх эпох.

5. Сабраць, сістэматызаваць і прааналізаваць археалагічны матэрыял (артэфакты) для выкарыстання ў рэканструкцыі асобных дэталяў інтэр'ера і знешняга ўбранства архітэктурнага комплекса (асобнага збудавання); вывучэння асаблівасцей развіцця матэрыяльнай культуры ў кантэксце гісторыі функцыянавання дадзеных комплексаў (асобных збудаванняў).

Гэтыя задачы запатрабавалі падбору адпаведных метадаў даследавання і дакладна выверанай структуры ў арганізацыі плануемых прац. Даследчыя мерапрыемствы былі разбіты на некалькі этапаў: падрыхтоўчы, асноўны, заключны. Кожны з іх патрабаваў выкарыстання асобых метадаў і прыёмаў даследавання, а таксама тэхнічнага абсталявання.

*Структура падрыхтоўчага этапу:*

1. Узгадненне дзействаў археолагаў з рэстаўратарамі. Пастаноўка мэт і задач, абранне методыкі запланаваных прац. Азнаямленне з аб'ектам.

2. Азнаямленне з наяўнай дакументацыяй па аб'екту. Гэта тапаграфічныя і геадэзічныя матэрыялы, справаздачы абмерачных прац, справаздачы аб праведзеных натурных даследаваннях, справаздачы аб даследаваннях і іспытах будаўнічых матэрыялаў, гісторыка-стылістычны аналіз будаўнічага развіцця будынкаў, заключэнне аб тэхнічным стане помніка з рэкамендацыямі па яго інжынернай рэстаўрацыі, вынікі архітэктурна-археалагічных абмераў, гісторыка-архіўныя і бібліяграфічныя даследаванні, справаздачы па архітэктурна-археалагічных даследаваннях. Адзначым, што падобная інфармацыя па рэзідэн-

цыям Берасцейшчыны знаходзіцца ў архіве праектнай дакументацыі ААТ “Брэстрэстаўрацыяпраект” [2 – 4; 6 – 10; 12 – 14].

3. Падрыхтоўка і ўзгадненне адпаведнай дакументацыі для правядзення археалагічных даследаванняў (заключэнне дагавора, атрыманне дазвола на археалагічныя даследаванні).

4. Збор і вывучэнне дадатковых гісторыка-архіўных і бібліяграфічных матэрыялаў, а таксама азнаямленне з вынікамі папярэдніх даследаванняў, у тым ліку археалагічных (калі такія ёсць).

5. Падрыхтоўка абсталявання для правядзення археалагічных даследаванняў, пошук працоўнай сілы, арганізацыя транспарта для патрэб экспедыцыі, пошук і арганізацыя функцыянавання базы археалагічнай экспедыцыі.

6. Узгадненне прац з прадстаўнікамі мясцовай улады і кіраўнікамі будаўніча-рэстаўрацыйных прац на аб’екце (калі такія ўжо вядуцца), а таксама правядзенне адпаведных мерапрыемстваў па ахове працы.

*Структура асноўнага этапу:*

1. Агляд помніка, аналіз тапаграфічнай і геадэзічнай сітуацыі, прывязка на мясцовасці.
2. Складанне сітуацыйнага плана. Калі такі план прадстаўлены рэстаўратарамі – абавязкова яго пераправерка і ўдакладненне згодна аб’ектыўнай сітуацыі на мясцовасці.
3. Вызначэнне (карэктыроўка) методыкі археалагічных даследаванняў на канкрэтным аб’екце (археалагічны надзор; закладка шурфоў, траншэй раскопаў).
4. Разбіўка раскопа (шурфа, траншэі) з прывязкай да канкрэтнага аб’екта і цэлага архітэктурнага комплекса.
5. Даследаване і фіксацыя культурных пластоў, ускрытых канструкцый і аб’ектаў праводзіцца згодна з абранай методыкай археалагічных і архітэктурна-археалагічных даследаванняў.
6. Нівеліроўка ў ходзе раскопак для аптымізацыі будучых прац рэстаўратараў павінна ажыцяўляцца па ўзгадненні з імі (рэперныя адзнакі ўзгадняюцца з рэстаўратарамі па канкрэтным архітэктурным збудаванні і суадносяцца з Балтыйскай сістэмай высот).

*Структура заключнага этапу:*

1. Дэмантаж, часовая кансервацыя, захаванасць у адкрытым выглядзе альбо поўная засыпка ўскрытых канструктыўных элементаў ці цэлых архітэктурных аб’ектаў, а таксама раскопаў.
2. Згортванне археалагічнай базы.
3. Правядзенне камеральнай і навуковай апрацоўкі сабранага матэрыялу.
4. Падрыхтоўка навуковай справаздачы з наступнай перадачай яе ў Інстытут гісторыі НАН Беларусі, а таксама заказчыку і праектна-рэстаўрацыйнай арганізацыі.

Зробім некалькі заўваг адносна заключнага этапу. Па заканчэнні аўтарам палявых прац на тэрыторыі шляхецкіх рэзідэнцый Берасцейшчыны, усе здабытыя матэрыялы былі перададзены ў лабараторыю гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна для далейшай апрацоўкі і вывучэння. Навуковая камеральная апрацоўка павінна вывучыць марфалогію і канструктыўныя элементы кожнай рэчы; вызначыць яе прызначэнне, матэрыял вырабу, тэхніку вытворчасці; вызначыць месца і час вырабу. Асобая ўвага надаецца атрыбуцыі і гісторыка-культурнай інтэрпрэтацыі індывідуальных знаходак і масавага матэрыялу шляхам пошуку аналогій. Для дакладнай датыроўкі бярэцца пад увагу суправаджальны археалагічны матэрыял, стратыграфічныя ўмовы залягання.

Усе археалагічныя калекцыі падлягаюць працэдуры сухой і вільгатнай ачысткі. Пасля праводзіцца праца па нанясенні шыфра на кожны артэфакт. Зашыфраваныя рэчы ўносяцца ў калекцыйны вопіс дзе пазначаецца тапаграфія знаходкі, апісанне захаванасці рэчы, яе асаблівасці, памеры. Навуковая справаздача па выніках археалагічных даследаванняў перадаецца ў Палявы камітэт Інстытута гісторыі НАНБ для экспертызы і прыняцця на захаванне ў Цэнтральны навуковы архіў НАНБ, Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі. Адначасова вынікі працы археолагаў перадаюцца ў праектную арганізацыю для дапаўнення, ўдакладнення і карэктыроўкі шырокага кола праектнай дакументацыі.

Пасля камеральнай апрацоўкі і навуковага вывучэння археалагічныя калекцыі з раскопак аўтара на тэрыторыі рэзідэнцыянальных комплексаў Берасцейшчыны размяшчаюцца на часовае захаванне ў фондах гістарычнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна. Археалагічныя калекцыі з раскопак рэзідэнцый Сапег і Пуслоўскіх пасля навуковай і камеральнай апрацоўкі перададзены на захаванне ў фонды рэгіянальных музеяў, адпаведна, – у Ружаны і Косава. Самыя прэзентабельныя рэчы занялі сваё месца ў пастаяннай экспазіцыі музея “Ружанскі палацавы комплекс рода Сапег”, адкрытага ў 2011 г., і ў часовай экспазіцыі Косаўскага палаца, адкрытага ў 2017 г.

**Заключэнне.** У заканчэнні адзначым, што арганізацыя археалагічных даследаванняў на рэстаўруемых рэзідэнцыянальных комплексах падпараткавана прынцыпам шчыльнага супрацоўніцтва археолагаў з архітэктарамі-праекцероўшчыкамі і будаўнікамі-рэстаўратарамі. Важнейшым ў гэтым супрацоўніцтве з’яўляецца падрыхтоўчы этап, калі ідзе ўзгадненне мэт і задач спецыялістаў, а таксама заключны этап, калі вынікі археалагічных даследванняў уключаюцца ў праектную дакументацыю рэстаўруемага архітэктурнага помніка. У выніку шматгадовых археалагічных раскопак аўтара на рэзідэнцыянальных комплек-

сах Берасцейшчыны дасягнуты значныя вынікі і назапашаны бясцэнны вопыт у арганізацыі архітэктурна-археалагічных даследаванняў, якія сталі неад'емнай часткай мерапрыемстваў па ўзнаўленні і захаванні цудоўных помнікаў беларускай архітэктуры.

ЛІТАРАТУРА

1. Башков, А. А. Шляхетские резиденции Брестчины в свете археологических исследований: Ружаны, Скоки, Коссово, Закозель / А. А. Башков ; М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина. – Брест : БрГУ, 2017. – 287 с.
2. Проектное предложение по реставрации и использованию. Памятник архитектуры XVI – XVIII вв. дворцовый ансамбль в г.п. Ружаны в Брестской обл. / С. Друщиц [и др.] // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Минск, 1979. – 19 с.
3. Калнин, В. Историко-архивные и библиографические изыскания по южному корпусу / В. Калнин // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Минск, 1990. – 35 с.
4. Калнин, В. Историко-архивные исследования по ансамблю / В. Калнин // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Минск, 1991. – 90 с.
5. Левко, О. Н. Практическая археология : учеб. пособие / О. Н. Левко. – Могилёв : МГУ им. А. А. Кулешова, 2006. – 256 с.
6. Олесевич, С. В. Историко-архивные и библиографические исследования. Памятник архитектуры XIX в. Усадебно-парковый ансамбль в д. Закозелье / С. В.Олесевич // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Брест, 1995. – 52 с.
7. Пенькевич, А. В. Историко-архивные и библиографические исследования. Объект: Памятник архитектуры XIX в. – дворец в Коссово / А. В. Пенькевич, Р. В. Боровой // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Минск, 1990. – 32 с.
8. Пенькевич, А. Комплексные научно-изыскательские работы. Восточная аркада. Альбом фотоиллюстраций. Памятник архитектуры XVI–XVIII вв. Дворцовый ансамбль в г. п. Ружаны Брестской обл. / А. Пенькевич, В. Синявский, А. Сухоцкий // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Минск, 1990. – 27 с.
9. Пенькевич, А. Комплексные научно-изыскательские работы. Восточный корпус. Альбом фотоиллюстраций. Памятник архитектуры XVI–XVIII вв. Дворцовый ансамбль в г. п. Ружаны Брестской обл. / А. Пенькевич, В. Синявский, А. Сухоцкий // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Минск, 1990. – 54 с.
10. Пенькевич, А. Комплексные научно-изыскательские работы. Восточный корпус. Памятник архитектуры XVI – XVIII вв. Дворцовый ансамбль в г.п. Ружаны Брестской обл. / А. Пенькевич, В. Синявский, А. Сухоцкий // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Минск, 1990. – 8 с.
11. Реставрация памятников архитектуры : учеб. пособие для вузов / Под общ. ред. С. С. Подъяпольского. – М. : Стройиздат, 1988 – 264 с.
12. Синявский, В. Эскизный проект. Памятник архитектуры XVI – XVIII вв. Дворцовый ансамбль в г.п. Ружаны Пружанского р-на Брестской обл. / В. Синявский, Н. Миронова // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Минск, 1992. – 10 с.
13. Синявский, В. Комплексные научно-изыскательские работы. Главный корпус. Памятник архитектуры XVI – XVIII вв. Дворцовый ансамбль в г.п. Ружаны Пружанского р-на Брестской обл. / В. Синявский, Н. Миронова // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Минск, 1992. – 8 с.
14. Трусаў, А. Справаздача аб правядзенні архітэктурна-археалагічных даследаванняў у 1989 г. / А. Трусаў, І. Чарняўскі // Архив проектной документации ОАО «Брестреставрацияпроект». – Мінск, 1990. – 85 с.
15. Трусов, О. А. Памятники монументального зодчества Беларуси XI – XVII вв.: архитектурно-археологический анализ / О. А. Трусов. – Минск : Наука и техника, 1988. – 160 с.

*Паступіў 05.03.2019*

## ORGANISATION OF ARCHAEOLOGICAL RESEARCH OF THE NOBLES' RESIDENCES IN THE BREST REGION OF THE XVI-XIX CENTURIES

***A. BASHKOU***

*Presented work overviews the basic principles of organisation of archaeological research of the nobles' residences on the territory of the Brest region of the XVI-XIX centuries. Attention has been focused on the cooperation of architect-designers and archaeologists in the study of the objects of residential architecture on which restoration works are carried out. Based on the experience of his fieldworks, the author identifies and characterises the main stages of the archaeological study of nobles' residences on the example of works in Ruzhany, Kossovo, Skoki, and Zakozel.*

***Keywords:*** *archaeological research, nobles' residences, Brest region, restored architecture.*